*Вольга Вараб’ёва*

# КАНТАМІНАЦЫЯ ПЕРАХОДНАГА ТЫПУ Ў ЧАРАДЗЕЙНЫХ КАЗКАХ

Праблема кантамінацыі ў казках разглядалася многімі даследчыкамі. Аднак і сёння яна пакідае шмат нявысветленых пытанняў. Агульнапрынятым стаў падзел кантамінацыі на творчую і механічную. Аналіз тэкстаў паказвае, што існуюць і іншыя варыянты кантамінавання. Фальклорны тэкст – гэта імправізаваны твор, таму злучэнне адзінак у ім залежыць ад многіх фактараў, сярод якіх ступень валодання казачнікам фальклорнай традыцыяй, мастацкае асэнсаванне тэксту, лексічнае багацце мовы апаведача, узрост і зацікаўленасць аўдыторыі і інш. У аснове размежавання відаў кантамінацыі палягаюць два крытэрыі: зместавы, які злучае сюжэты ў ідэйна-тэматычным плане і выяўляецца праз адпаведнасць героя характару ствараемага вобраза, і структурны, які забяспечвае цэласнасць твора праз логіку развіцця падзей. Адпаведна да творчай кантамінацыі адносяць тэксты, у якіх абодва крытэрыі вытрыманы, а да механічнай – тыя творы, у якіх яны парушаны. Казкі, спалучэнне ў якіх захоўвае толькі адзін з вызначаных крытэрыяў, мы назвалі пераходнымі, або пераходнага тыпу. Яны найменш даследаваліся ў навуковай літаратуры. Кантамінацыі пераходнага тыпу разгледзім на прыкладзе змяяборчых сюжэтаў чарадзейных казак.

Адным з самых распаўсюджаных змяяборчых сюжэтаў з’яўляецца № 300А «Пераможца змея»,* які актыўна кантамінуецца з сюжэтнымі тыпамі розных тэматычных груп. Вялікая колькасць кантамінацый пераходнага тыпу зафіксавана намі сярод спалучэння 300А + 303 «Два браты». Абодва сюжэты адносяцца да змяяборчых, перамога ў іх магчыма толькі шляхам фізічнага знішчэння ворага, таму героі павінны валодаць адпаведнымі якасцямі: быць смелымі, мужнымі, надзейнымі, вернымі свайму слову. Іменна такімі браты і паўстаюць перад намі ў казках «Мікіта Ігрівіч, купецкій сын» [3, *382–394*], «Іван Іванавіч Кабылін сын» [2, *133–142*], «Мядзвежыя сыны» [3, *60–70*]. Таму сэнсавай супярэчнасці паміж героямі кантамінаваных сюжэтаў няма. У структурным плане такое спалучэнне сюжэтаў традыцыйна абгрунтоўваецца або нулявым структурным элементам «Сваяцтва адмоўных герояў», або злучальным матывам «Забарона і яе парушэнне». У пералічаных казках абгрунтаванне адсутнічае. Так, у казцы «Мікіта Ігрівіч, купецкій сын» відавочны пропуск злучальнага матыву «Забарона і яе парушэнне». Герой пасля шлюбу з выратаванай царэўнай ідзе ў лес і сустракае там «старую», якая і ператварае яго ў камень. У казцы адсутнічаюць звесткі пра зачараванасць лесу і небяспеку, якая чакае кожнага, хто туды пойдзе, не раскрываюцца злыя намеры ці дрэнныя ўчынкі ведзьмы да сустрэчы з нашым героем, што робіць спалучэнне сюжэтаў механічным, а паводзіны героя са «старой», яго непавага і нават грубасць незразумелымі. Ніяк не матывавана з’яўленне новага адмоўнага персанажа і ў іншых названых творах.

Разгледжаныя казкі маюць кальцавую кампазіцыю. Пачынаюцца яны матывамі цудоўнага нараджэння братоў, іх клятвай вернасці адзін аднаму, якія адносяцца да сюжэта 303, затым разгортваецца сюжэт 300А, пасля вырашэння тэмы якога раскрываюцца асноўныя падзеі № 303 – пацвярджаецца вернасць свайму слову і братэрству. Такая кампазіцыя садзейнічае арганічнаму злучэнню сюжэтаў, больш цеснаму іх адзінству, чым паслядоўная кампазіцыя пры кантамінацыі тых жа сюжэтных тыпаў, як, напрыклад, у казцы «Пра трох братоў ахотнікаў» [4, *492–495*]. У ідэйна-тэматычным плане такая перастаноўка не ўплывае на логіку развіцця характару героя, паколькі ён з'яўляецца змагаром і вызваліцелем у абодвух сюжэтах, аднак структурна яна абавязкова патрабуе моцнага абгрунтавання. Парамога над пачварай і выратаванне братоў з'яўляецаа лагічным і вычарпальным завяршэннем сюжэта 303, які не ўтрымлівае ў сваім змесце імкнення герояў да асабістага шчасця. Таму творчае злучэнне сюжэтаў магчыма толькі праз злучальны матыў, адсутнасць якога і дазваляе гаварыць пра фармальную структурную злучанасць, што адпавядае кантамінацыі пераходнага тыпу.

Два змеяборчыя сюжэты спалучаюцца ў казцы «Суччы сын» [5, *62–65*]. У аснове першага – змаганне братоў са шматгаловымі змеямі і фізічнае знішчэнне апошніх, у цэнтры другога сюжэта – помста змяіх за забітых братоў, сыноў ці мужоў і перамога асілкаў над імі, істотамі, якія валодаюць не толькі вялікай сілай, але і чарадзейнымі ўласцівасцямі (могуць прымаць рознае аблічча). Заўважым, што фізічнае знішчэнне адной з пачвар, маці змеяў або жонкі дванаццацігаловага змея, у некаторых тэкстах увогуле немагчыма: герой здольны толькі перакаваць яе ў іншую істоту (кабылу, жанчыну) з адпаведнымі ёй якасцямі. Такое супрацьстаянне па-новаму раскрывае і вобраз галоўнага героя: волат павінен праявіць не толькі сілу і спрыт, але кемлівасць, разважлівасць і нават хітрасць. Змаганне са змяіхамі – самастойны сюжэт з усімі абавязковымі структурнымі часткамі. На жаль, як самастойны, ён не вылучаны ні ў адным з паказальнікаў казачных сюжэтаў, а ў якасці часткі ўключаны ў сюжэтны тып № 300*В «Бой на калінавым мосце». Барацьба са змеямі, аднак, ужо адлюстравана ў паказальніках пад № 300А «Пераможац змея» і ад сюжэта 300*В яго адрознівае менавіта змаганне са змяіхамі. Каб не ўносіць блытаніну, прапануем сюжэт № 300*В «Бой на калінавым мосце» выкарыстоўваць з удакладненнем «Помста змяіх». Такім чынам, у казцы «Суччы сын» спалучаюцца сюжэты 300А «Пераможца змея»+ 300*В «Бой на калінавым мосце» («Помста змяіх»). Пры такой кантамінацыі, як правіла, супярэчнасцей зместавага плану не адзначана. Герой ўвасабляе лепшыя якасці змагара і абаронцы. У структурным плане традыцыйным матывам-абгрунтаваннем з'яўляецца злучальны матыў «рада змяіх», узмоцнены ўнутранай сувяззю – сваяцтвам адмоўных персанажаў. Адсутнасць такога матыву прыводзіць да парушэння логікі ходу дзеяння, фрагментарнага ўспрыняцця кантамінаванага тэксту. У названай казцы адсутнасць злучальнага матыву робіць нявытлумачанымі ўчынкі героя, які забівае сустрэчнага ката, сячэ рэчку. Асілак беспамылкова распазнае і

выкрывае ворагаў, аднак яго дзеянні павінны быць зразумелымі слухачу безумоўна. Менавіта давер да героя, упэўненасць у яго праваце, адсутнасць сумненняў у маральнасці персанажа і яго ўчынкаў ствараюць вобраз ідэальнага заступніка.

Тэксты, якія ўключаюць толькі змеяборчыя сюжэты, даволі цесна звязаны паміж сабой у ідэйна-тэматычным плане. У іх адзін герой, місія якога – усеагульны дабрабыт і шчасце, традыцыйны вораг, якога неабходна знішчыць. Таму часцей у такіх казках мы сустракаемся з парушэннямі структурнага плану, якія, думаецца, не столькі з'яўляюцца сведчаннем забыцця традыцыі, колькі выяўляюць недастатковае валоданне казачнікам прыёмамі мастацкага расказвання.

Сярод запісаў тэкстаў сустракаюцца творы, у якіх не вытрыманы зместавы крытэрый. Яркім прыкладам кантамінацыі пераходнага тыпу з незахаваннем зместавага крытэрыя з'яўляецца казка «Кацігарошак» [5, *208–220*]. Казка трохсюжэтная, спалучае сюжэты *312 І «Брат выратоўвае ад змея сястру і братоў»+ 300А «Пераможца змея» + 300*В «Бой на калінавым мосце» («Помста змяіх»), якія адносяцца да змеяборчых.

Першы сюжэт паказвае нам героя змагара і выратавальніка, смелага і самаахвярнага асілка, які яшчэ ў чэраве маці вяшчае: «*Я зашчытнік буду вам і добрым людзям*» [5, *21*1]. Яго ўчынкі пацвярджаюць гэтыя словы: герой выратоўвае ад лютага змея сваю сястру, ажыўляе забітых братоў і вяртаецца з імі да бацькоў. Крыўда героя, выкліканая няўдзячнасцю выратаваных ім братоў і сястры (апошні матыў першага сюжэта), з аднаго боку, становіцца абгрунтаваннем адыходу асілка ў свет, але, з іншага боку, ставіць пад сумненне далейшую рэалізацыю яго жыццёвай праграмы быць «*зашчытнікам*». Факт пакрыўджанасці пазбаўляе Кацігарошка арэолу велічнасці і самаахвярнасці, які звычайна суправаджае герояў-выратавальнікаў. Падзеі ў другім сюжэце, аднак, разгортваюцца ў межах традыцыі: волат не выяўляе супярэчнасцей са сваёй першапачатковай місіяй. І хоць матывацыю адыходу (крыўду) нельга лічыць нулявым структурным элементам, паколькі яна не патрабуе ад героя далейшых актыўных дзеянняў, далучэнне другога сюжэта абгрунтоўваецца злучальным матывам «выратаванне людзей»: «*Змей людзей выядае, то ідзем яго біць*» [5, *216*], што з'яўляецца паказчыкам творчай кантамінацыі. Алагічныя ўчынкі героя-выратавальніка ў трэцім сюжэце, калі той, ратуючыся ад смерці, узяў «*абоіх таварышчэй і ўбросіў у рот*» [5, *219*] змяі, не стасуецца з вобразам абаронцы, супярэчаць логіцы развіцця вобраза, і кантамінацыю, такім чынам, з улікам вытрыманасці структурнага крытэрыя мы аднеслі да пераходнага тыпу.

З сюжэтаў іншых тэматычных груп найбольш актыўна спалучаецца са змеяборчымі № 315 А «Звярынае малако». Галоўны герой сюжэта паказаны ў працэсе сталення. Спачатку ён яшчэ дзіця. Мы бачым яго паступовы рост, набыццё ім практычнага вопыту, мудрасці, сілы. Змеяборчы сюжэт найлепш можа выявіць яго фізічную дасканаласць. Кантамінацыя сюжэта 315А з рознымі змеяборчымі паказвае героя кожны раз па-новаму, дазваляючы яму праявіць сябе то смелым і дужым, то разумным і бескампрамісным, то шчырым і справядлівым.

У казцы «Царский унук Лыцарь Давидонович» [3, *117–123*] спалучаюцца сюжэты 315А + 302 «Смерць Кашчэя ў яйцы». Герой праяўляе сябе ў абодвух сюжэтах актыўнай асобай (ён сам змагаецца і дасягае і пастаўленай мэты і ў першым сюжэце, і ў другім), аднак паслядоўная кампазіцыя дадзенага твора абцяжарвае структурнае злучэнне сюжэтаў. Асілак са словамі «*няма мне тут месца*» [3, *120*], што можна прыраўняць фармальнай звязцы, паколькі гэты выраз не раскрывае далейшыя мэты героя і прычыны іх узнікнення, пайшоў у свет. Толькі фармальнай звязкай выражаны структурны элемент і ў казцы «Іван Златавус» [2, *67–73*], якая спалучае сюжэты 315А+301В «Тры царствы»: герой, якога хацела забіць родная маці ў змове са змеем, «*кінуў маці і пайшоў*» [2, *71*]. Пакідае здрадніцу-сястру, а сам адыходзіць у свет і герой казкі «Пушча-драмушча» [2, *40–45*], у якой кантамінуюцца 315А+300А «Пераможца змея». Як бачым, структурная недасканаласць адмоўна ўплывае на эмацыянальнае ўспрыняцце твора, на яго цэласнасць і маналітнасць, што і сведчыць пра кантамінацыю пераходнага тыпу, а не творчую.

Казка «Салдат Іванька, мыш, жук і рак» [3, *81–88*] спалучае сюжэты 559 «Несмяяна-царэўна»+301А «Тры царствы». Характар героя ў першым сюжэце выяўляе такія якасці, як дабрыня, спагада, шчырасць. Дзякуючы ім, салдат змог рассмяшыць царэўну і ўзяць з ёй шлюб. У другім сюжэце перад намі паўстае герой-вызваліцель, абаронца. Стаць такім яму дапамагае чароўны конь. Конь дарує герою сілу, у выніку якой апошні тройчы неапазнана перамагае войска і мае магчымасць праявіць сябе сапраўдным воінам-вызваліцелем. Заўважым, што незвычайныя істоты раскрываюць свае чароўныя ўласцівасці толькі высокамаральным героям, якім і з’яўляецца салдат. Такім чынам, супярэчнасцей у паказе героя ў казцы няма. Абгрунтаванне ж паміж сюжэтамі адсутнічае, што адносіць кантамінацыю да пераходнага тыпу.

Цікавым прыкладам кантамінаванага твора з’яўляецца ўкраінская казка «Дурний Іван та його побратими» [1, *79–84*]. Першы сюжэт казкі не адносіцца да чарадзейных. Галоўны герой – Іван-дурань, чалавек, якому шанцуе выпадкова. Падкрэсліваецца выпадковасць знаходжання грошай у дупле дрэва, выпадковасць, прычым гіпербалізаваная, сустрэчы з разбойнікамі ў лесе. Абгрунтаваннем другога сюжэта можна лічыць матыў «пошукі таварышаў»: «*Озброївся і йде шукатн друзів, бо братів як нема, так нема*» [1, *81*]. Другі сюжэт адпавядае вызначанаму № 300А з двайной матывіроўкай: 1)«*Няма води. Дванадцятиголовий змій усі криниці висушив, а в одній, де е вода, – сам сидить*» [1, *81*], 2) «*Царівно, я тебе врятую*». – «*Якшо мене врятуеш, стану твоею дружиною*» [1, *82*]. Другая падкрэслівае асабістую зацікаўленасць героя ў выніках перамогі. Цэнтральны канфліктны матыў – барацьба са змеем. Ён мае ўскладненне – апісанне дапамогі пабрацімаў, што зніжае гераічны пафас змагання. Матыў вырашэння тэмы – шлюб. У сюжэт уключана шмат элементаў ускладнення і цэлых матываў, характэрных для іншых жанравых разнавіднасцей казкі. Так, казка заканчваецца судом над здраднікам-міністрам, суддзёй на якім выступае

мядзведзь, пракурорам – воўк, прысяжнымі – ліс і заяц. Аднак ядро сюжэта адпавядае змеяборчаму. Няма сумненняў, што ў казцы два сюжэты. Адзін з іх змеяборчы. Кантамінацыя паміж стылістычна рознымі сюжэтамі ўскладніла задачу казачніка, які імкнуўся змякчыць стылістычную стракатасць увядзеннем неўласцівых сюжэту матываў і свядома абыйшоў некаторыя моманты, звязаныя з характарыстыкай героя. Герой у абодвух сюжэтах толькі намінальна адзін. Ідэйна ён не можа спалучаць у сабе рысы абодвух персанажаў. Таму кантамінацыю ў выніку незахаванасці зместавага крытэрыя мы аднеслі да пераходнага тыпу.

Такім чынам, кантамінацыі пераходнага тыпу ілюструюць пошукі новых форм і сродкаў спалучэння сюжэтаў, аднак разам з тым яны паказваюць змяншэнне ролі казкі ў жыцці грамадства, затуханне актыўнай казачнай традыцыі.

## ЗАЎВАГІ

* Сюжэтныя тыпы прыведзены па выданню «Паказальнік сюжэтаў беларускіх казак» (склад. К. П. Кабашнікаў), змешчаным ў : Чарадзейныя казкі: у 2 ч. Ч. 2. Мінск, 2003. – С. 594–678.

## ЛІТАРАТУРА

1.Казки Підгір’я. Запис, літ. підгот. текстів та упоряд. С. Г. Пушика. Ужгород, 1976.

2. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник. Вып. III / Е. Р. Романов. Витебск, 1886.

3. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник. Вып. VI / Е. Р. Романов. Могилёв, 1901.

4. Смоленский этнографический сборник / сост. В. М. Добровольский. Ч. 1. Санкт-Петербург, 1891.

5. Чарадзейныя казкі: у 2 ч. / склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч. Ч. 1. Мінск, 2003.